УДК 293.3 (476)

Н.Г. Балтрушэвіч

# Утварэнне Усесаюзнага саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў (УСЕХБ). Далучэнне пяцідзесятнікаў (на прыкладзе БССР)

Утварэнне Усесаюзнага саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў (УСЕХБ) у кастрычніку 1944 г. з'яўляецца адной з цэнтральных падзей у гісторыі пратэстанцкай царквы пасляваеннага перыяду. Паступова пераўтварыўшыся ў буйную цэнтралізаваную арганізацыю, Саюз кардынальна ўплываў на развіццё канфесіі на працягу 40–80-х гг. XX ст.

Сёння гэтай падзеяй цікавяцца як гісторыкі, так і грамадства ўвогуле. Аднак, нягледзячы на адкрытасць і даступнасць архіўных матэрыялаў, гэтая падзея ў гісторыі пратэстантызму, як і многія іншыя, разглядаецца неадназначна і мае шмат супярэчнасцей. Вось чаму мэтазгодна для больш глыбокага асэнсавання пытання разгледзець шматпланава сам працэс аб'яднання, яго прычыны і наступствы.

Аналіз гісторыі баптызму робіць відавочным той факт, што працэс аб'яднання розных накірункаў пратэстантызму ў 40-я гг. XX ст. не з'яўляўся нечаканым і неспадзяваным. Аднак, пры глыбокім даследаванні перад намі паўстае ўсё ж такі лагічнае пытанне: чаму менавіта ў часы кіравання Сталіна адбылося гэтае аб'яднанне, якое Л.М. Мітрохін назваў у сваім філасофска-сацыялагічным нарысе «шлюбам па-савецку»? [1].

Найменне «евангельскія хрысціяне-баптысты» склалася гістарычна з дзвюх назваў роднасных плыняў: баптыстаў, якія першапачаткова называліся хрысціянамі, ахрышчанымі па веры (рассяліліся ў сярэдзіне XIX стагоддзя на поўдні Расійскай імперыі), і евангельскіх хрысціян, якія з'явіліся некалькі пазней і пераважна пражывалі на поўначы краіны [2]. Саюз баптыстаў быў ліквідаваны яшчэ ў 1935 г., і цэлы рад яго прыхільнікаў быў вымушаны перайсці ў цудам уцалелы Усесаюзны саюз евангельскіх хрысціян (УСЕХ). Пачаткам сумеснай работы баптыстаў і евангельскіх хрысціян можна лічыць стварэнне ў маі 1942 г. часовага Усесаюзнага савета евангельскіх хрысціян і баптыстаў, які звярнуўся з заклікам да паствы выступіць кожнаму супраць фашызму, а таксама арганізаваў збор сродкаў на карысць фронту, садзейнічаў добраахвотнай працы баптыстаў у шпіталях і прытулках [1]. У гэты ж час яго прадстаўнікі ад імя баптысцкага брацтва звярнуліся ва УСЕХ з прапановай прыняць на сябе апеку і клопат пра абшчыны баптыстаў. У кастрычніку 1944 г. на нарадзе прадстаўнікоў двух цэркваў было прынята рашэнне аб аб'яднанні гэтых цэркваў і ўрэгуляванні спрэчных пытанняў. Умовы аб'яднання ў асноўным дубліравалі пагадненне 1920-га года: усе абшчыны па магчымасці павінны мець пасвячоных (у духоўны сан) прэсвітэраў, якія і ажыццяўляюць цырымоніі хрышчэння, хлебапраламлення і шлюбу. Але пры

адсутнасці пастараў падобныя дзеянні можа праводзіць і не пасвячоны член абшчыны, але толькі па даручэнні царквы. Было таксама вырашана, што хрышчэнне і шлюб, якія ажыццяўляюцца як з ускладаннем рук на «крещаемых и брачующихся», так і без яго, маюць аднолькавую сілу. У тым жа рэчышчы было вырашана пытанне пра хлебапраламленне: «Вечеря Господня, или хлебопреломление может совершаться как путем разламывания хлеба на множество мелких частей, так и путем разламывания на две, три или несколько крупных частей» [1, с. 400].

Такім чынам, афіцыйнае аб'яднанне двух Саюзаў у Царкву евангельскіх хрысціян-баптыстаў, якую ўзначаліў Усесаюзны савет евангельскіх хрысціян-баптыстаў, што знаходзіўся ў Маскве, адбылося. Было выпрацавана Палажэнне Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў; прынята сістэма ўпаўнаважаных (старшых прэсвітэраў), якія кіравалі і ўзначальвалі абшчыны на месцах. Па Беларускай ССР старшым прэсвітэрам быў прызначаны В.М. Чэчнеў [2, с. 232]. З 1945 г. пачаў выдавацца часопіс «Брацкі веснік».

Менавіта такой выглядае савецкая афіцыйная трактоўка працэсу ўтварэння Саюза. Аднак, вывучаючы гісторыю ўзнікнення УСЕХБ, сёння можна з упэўненасцю сцвярджаць, што аб'яднанне двух накірункаў пратэстантызму насіла штучны характар. Такога пункту погляду прытрымліваецца большасць даследчыкаў, у тым ліку і прызнаны даследчык баптызму Л.М. Мітрохін. Пры гэтым усе адзначаюць, што за падобнае зліцце розных плыняў пратэстанцкай канфесіі паміж сабой і з дзяржавай у пасляваеннае дзесяцігоддзе выступалі як савецкія дзяржаўныя органы ўлады, так і самі веруючыя. Іншая справа, што ў кожнага з бакоў былі свае мэты, а ў веруючых – і вопыт дзяржаўна-царкоўных узаемаадносін мінулых гадоў.

Савецкія ўлады ў час і пасля вайны зрабілі шмат захадаў па пераглядзе і пэўнай лібералізацыі сваіх адносін з канфесіямі, высока ацаніўшы вялікі ўклад веруючых у Перамогу. Нягледзячы на гэта, з аднаго боку, канструктыўны дыялог дзяржава будавала толькі з праваслаўнай царквой, а з другога – савецкае кіраўніцтва пры гэтым не адвяргала, а імкнулася кантраляваць дадзеную сферу дзейнасці грамадства цалкам. Аднак па пастанове СНК Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь 11.01.1922 г. «Аб аддзяленні царквы ад дзяржавы і школы ад царквы» царкву як сацыяльны інстытут нельга было непасрэдна ўключыць у сістэму савецкай улады, бо:

1. У межах БССР царква ад дзяржавы аддзяляецца.
2. Школа ад царквы аддзяляецца.
3. Навучаць і навучацца рэлігіі могуць толькі прыватным чынам [3].

Аднак з гэтай сітуацыі было знойдзена выйсце. Так, па-першае, дзяржава стварыла пры ўрадзе ў 1943–1944 гг. у якасці кантралюючых органаў Савет па справах Рускай праваслаўнай царквы і Савет па справах рэлігійных культаў, якім адводзілася роля пасрэднікаў у адносінах паміж дзяржавай і царквой; а, па-другое, савецкія ўлады прынялі рашэнне аб стварэнні царкоўных структур, якія ўзначальвалі б падатлівыя кіраўнікі, і, выкарыстоўваючы метад «пугі і перніка», паспрабавалі ўздзейнічаць на стан мясцовых цэркваў і масавую рэлігійную свядомасць [1, с. 401]. Гэта быў найбольш прымальны для дзяржавы механізм узаемаадносін, бо разглядаўся як сродак нябачнага ўмацавання кантролю за канфесіямі.

Веруючыя, памятаючы пра жорсткія ганенні 1930-х гг., былі вымушаны згаджацца і чымсьці ахвяраваць, каб захаваць і прапаведаваць свае рэлігійныя каштоўнасці. Для іх галоўным станоўчым фактарам у дадзенай сітуацыі з'яўлялася набыццё статусу легальнай (зарэгістраванай) рэлігійнай арганізацыі і магчымасць аднаўлення сваіх разбураных структур. Лідэры евангельскіх хрысціян, якія па сваёй колькасці і згуртаванасці абшчын за-

усёды значна саступалі баптыстам, прыкметна ўмацоўвалі ўласныя пазіцыі, бо і старшыня УСЕХБ (Я.І. Жыдкоў) і генеральны сакратар (А.В. Карэў) былі абраны з іх ліку [1, с. 400]. Аднак нельга не ўлічваць, што веруючыя страчвалі пэўныя свабоды ў ажыццяўленні рэлігійнай дзейнасці, прыстасоўваючыся да савецкага заканадаўства.

У 1945 г. да аб'яднанай царквы ЕХБ далучыліся пяцідзесятнікі. На думку баптысцкіх ідэолагаў савецкага перыяду прычынай аб'яднання з'явілася беспрэцэдэнтная ў гісторыі чалавецтва вайна, яна «расплавіла сэрца веруючых, вымусіла іх забыць усе былыя сваркі з-за найменняў» [4]. Аднак на самай справе прычын, па якім адбылося аб'яднанне, некалькі: вайна, скарачэнне колькасці веруючых, крызіс у саміх рэлігійных арганізацыях і, галоўнае, гэта канфесіянальная палітыка савецкай дзяржавы, якая пачалася яшчэ ў 30-я гг. і працягвалася ў наступныя гады ў адносінах да пратэстантаў, і, у прыватнасці, пяцідзесятнікаў.

Пяцідзесятніцтва ўзнікае напярэдадні XX ст. у Злучаных Штатах Амерыкі з пратэстанцкага фундаменталізму. Уласцівыя пяцідзесятнікам місіянерская агрэсіўнасць і варожасць да іншых хрысціянскіх аб'яднанняў выклікалі ў адказ ад іншых канфесій і свецкай улады ўціск і ганенні, а таму першапачаткова хрысціяне веры евангельскай (іншая назва пяцідзесятнікаў) дзейнічалі скрытна [1, с. 402]. Вельмі істотным з'яўляецца і тое, што з самага пачатку лідэры баптыстаў і евангельскіх хрысціян надта падазрона і варожа сустрэлі дзейнасць пяцідзесятнікаў. Ужо ў 1913 г. лідэр расійскіх пяцідзесятнікаў А. Іваноў і яго паслядоўнікі былі адлучаны ад царквы евангельскіх хрысціян і кваліфікаваліся як «трасуны». У сваю чаргу пяцідзесятнікі падобным чынам ацэньвалі і баптыстаў.

Пяцідзесятнікі, як і баптысты, вераць у трыадзінага Бога, у збавіцельную ахвяру Ісуса Хрыста, у Яго другое прышэсце, а таксама ў замагільнае жыццё, у боганатхнёнасць і святасць біблейскіх кніг [5]. Асноўнае адрозненне і галоўная спецыфіка веравызнання пяцідзесятнікаў – гэта вучэнне аб «хрышчэнні Святым Духам» і «гласалалія» (ад грэч. Qlossa – незразумелае слова, Lallin – гаварыць), што азначае працэс гаварэння на «иных языках» і служыць абавязковым «сімвалам хрышчэння Духам Святым».

Гэтыя асаблівасці богаслужэння вельмі істотныя. І таму адказ ад адной з іх, асабліва ад гласалаліі, азначаў для перакана극ых пяцідзесятнікаў адказ ад неад'емнай спецыфікі ўласнай царквы, ад самога існавання сваёй веры і звычайных спосабаў яе вырашэння. Да таго ж былі і яшчэ больш дробныя адрозненні ў абраднасці [1, с. 405].

Трэба ўлічваць і той факт, што ў сярэдзіне 1940-х гг. пяцідзесятніцтва выступала як разнашэрсны рэлігійны рух. Яго самыя вялікія разнавіднасці былі прадстаўлены так званымі варанаеўцамі і хрысціянамі ў духу апосталаў, ці смародзінцамі (па прозвішчах заснавальнікаў – І.Е. Варанаева і Н.П. Смародзіна). Акрамя таго, меліся пяцідзесятнікі – сіяністы, шмідтаўцы, лявонцьеўцы, мурашкоўцы і інш. Такім чынам, відавочна, што ні дагматычных, ні гістарычных традыцый па аб'яднанні розных пратэстанцкіх накірункаў у 40-я гг. не было.

Вось чаму і сёння вельмі складана да канца зразумець прычыны такога аб'яднання і згоды на яго як аднаго, так і другога бакоў. Што датычыцца УСЕХБ, то, на думку Л.М. Мітрохіна, на яго моцна «нажалі» прадстаўнікі савецкай улады, а ім адмовіць, зразумела, кіраўніцтва евангельскіх хрысціян-баптыстаў не адважылася. Дзяржаўныя інстытуты, якія падтрымалі ідэю аб'яднання, палічылі для сябе лепшым кантраляваць і ўздзейнічаць на стан і свядомасць пяцідзесятнікаў праз легалізацыю іх дзейнасці. Галоўнай умовай аб'яднання пры гэтым з'ўлялася адмова пяцідзесятнікаў ад вызначальных дагматычных прынцыпаў і выкананне савецкага заканадаўства ў галіне рэлігіі.

А чаму ж на гэта пайшлі кіраўнікі хрысціян веры евангельскай, тым больш, што, па сведчанні УСЕХБ, ініцыятыва зыходзіла менавіта ад іх? Па разважаннях таго ж Л.М. Мітрохіна, яны таксама, як і раней баптысты, жадалі атрымаць легальны статус [1, с. 406]. У пасляваенныя годы пяцідзесятнікі не маглі разлічваць на легальнае існаванне і тым больш на рэгістрацыю, бо яны разглядаліся атэістычнай прапагандай як «изуверская секта», якая займаецца антысавецкай дзейнасцю. Таму, выкарыстаўшы значнае пацяпленне ў дзяржаўна-царкоўных адносінах пад час вайны, пяцідзесятнікі згаджаюцца на ўваходжанне ў Саюз ЕХБ. Аднак у архівах сустракаюцца сведчанні пра імкненне пяцідзесятнікаў стварыць на Беларусі асобную цэнтралізаваную рэлігійную арганізацыю задоўга да афіцыйнага аб'яднання. Так, у 1944 г. на тэрыторыі Баранавіцкай вобласці з ведама аблвыканкама для былых кіраўнікоў пяцідзесятнікаў на чале з І. Панько, якія, жадаючы захаваць сваю «самасційнасць», стварылі незалежны цэнтр – «Царкву хрысціян веры евангельскай», былі выраблены круглая пячатка і штамп, а таксама быў намер склікаць з'езд духавенства ў г. Пінску [6]. У красавіку – чэрвені 1945 г. у г. Баранавічы быў арганізаваны цэнтр Духоўнага Епіскапата абшчыны ХВЕ (пяцідзесятнікаў) БССР, Літоўскай ССР і Украінскай ССР, на чале якога стаяў епіскап І. Панько і Генеральны сакратар С. Вашкевіч. Яны мелі сваю пячатку, зацверджаную яшчэ ў 1944 г.

Пасля праверкі дакументаў у красавіку 1945 г. упаўнаважаны па Брэсцкай вобласці канфіскаваў пячатку, штамп і распусціў створаны ў Баранавічах Епіскапат. Там жа ўпаўнаважаны канстатаваў, што рэгістрацыя абшчын ХВЕ не ажыццяўляецца, але на ўліку знаходзяцца 22 абшчыны, у якіх адбываецца богаслужэнне [6, арк. 36].

Гэты факт яшчэ раз даказваў, што толькі саюз з ЕХБ з'яўляўся адзіным спосабам легалізацыі дзейнасці і захавання паствы для пяцідзесятнікаў.

Такім чынам, атрымаўшы згоду ў партыйных структурах і падлічыўшы ўсе «за» і «супраць», у жніўні 1945 г. кіраўнікі хрысціян веры евангельскай з Беларусі І. Панько і С. Вашкевіч, а таксама ўкраінскія пяцідзесятнікі звярнуліся ва УСЕХБ з прапановай абмеркаваць магчымасці і ўмовы ўваходжання ў Саюз ЕХБ. З 19 па 29 жніўня праходзілі нарады, вынікам якіх стаў прыняты 29 жніўня дакумент, вядомы як «Жнівеньскае пагадненне». Пасля яго падпісання ў верасні – лістападзе 1945 г. пачалася кампанія па аб'яднанні. Ужо 23 верасня 1945 г. пры ўдзеле прадстаўнікоў пяцідзесятнікаў упаўнаважаным УСЕХБ па Беларусі В. Чэчневым, яго намеснікам І. Панько і старшым прэсвітэрам С. Вашкевічам была праведзена растлумачальная работа з прэсвітэрам царквы ХВЕ Маладзечанскай вобласці І. Кульбіцкім, у выніку якой усе існуючыя абшчыны пяцідзесятнікаў без пярэчання далучыліся да УСЕХБ. Усяго ў выніку праведзенай В. Чэчневым, І. Панько, С. Вашкевічам і прыбыўшым з Масквы прадстаўніком УСЕХБ І. Івановым агітацыйнай работы на тэрыторыі Беларусі далучыліся да УСЕХБ 83 абшчыны пяцідзесятнікаў, з іх: па Маладзечанскай вобласці 17 абшчын, па Баранавіцкай – 39, Пінскай – 19, Брэсцкай – 8 [6, арк. 113–114]. Так, пяцідзесятнікі Маладзечанскай вобласці далучыліся да саюза ЕХБ 23 верасня 1945 г. Упершыню ў вобласці пяцідзесятнікі з'явіліся ў 1924–1925 гг. у Радашковіцкім раёне, арганізатарам чаго з'яўляўся жыхар гэтага раёна Нядзвецкі. Да моманту аб'яднання пяцідзесятнікаў з ЕХБ у 1945 г. па вобласці налічвалася 14 абшчын пяцідзесятнікаў, рост якіх вызначаўся такім чынам:

у 1925 г. арганізавана 2 абшчыны,

1927 г. – 1

1928 г. – 2

1929 г. – 2

1931 г. – 1

1932 г. – 2
1933 г. – 3
1935 г. – 1

Усяго ж – 14, у якіх, па прыкладных дадзеных, на 1.01.1946 г. налічвалася да 882 чал. [6, спр. 5, арк. 2]. У Гродзенскай вобласці аб'яднанне пяцідзесятнікаў да абшчын ЕХБ адбылося на аснове рашэння УСЕХ і Б ад 21.11.1945 г. № 279 [6, спр. 5, арк. 11].

Такім чынам, на Беларусі поўнае аб'яднанне пяцідзесятнікаў з евангельскімі хрысціянамі-баптыстамі было завершана ў кастрычніку 1948 г., пра што паведамлялася на пашыранай нарадзе Савета ЕХБ.

У 1945 г. былі завершаны арганізацыйныя мерапрыемствы на Беларусі. Так, абшчыны ЕХБ, а затым і пяцідзесятнікаў у рэспубліцы пачалі ўзначальваць Віктар Мікалаевіч Чэчнеў і яго намеснік Іван Калінкавіч Панько. Усесаюзны савет евангельскіх хрысціян-баптыстаў выконваў свае функцыі праз абласных упаўнаважаных – быў створаны інстытут абласных старшых прэсвітэраў, у склад якога ўвайшлі:

1. Па Мінскай вобласці – П.А. Іванчанка.
2. Па Бабруйскай вобласці – Я.М. Анікеенка.
3. Па Баранавіцкай вобласці – І.Г. Шатура.
4. Па Пінскай вобласці – С.І. Вашкевіч.
5. Па Брэсцкай вобласці – А.І. Аляксееў.
6. Па Гродзенскай вобласці – К.І. Сявашка.
7. Па Маладзечанскай вобласці – І.К. Кульбіцкі.

У астатніх 5 абласцях падбор старшых прэсвітэраў працягваўся ў далейшым [6, арк. 287]. Галоўным іх абавязкам быў кантроль за выкананнем баптысцкімі абшчынамі заканадаўства аб культах і сакрэтных інструкцый упаўнаважаных Савета па справах рэлігій. І тым не менш сумесныя мерапрыемствы па ўмацаванні Саюза ЕХБ і пяцідзесятнікаў давалі станоўчыя вынікі. Так, калі ў 1945 г. на Беларусі дзейнічалі 139 абшчын ЕХБ з колькасцю веруючых 8006, абшчын ХВЕ – 93, з колькасцю веруючых 9430, то ўжо на 1.10.1946 г. выяўлена 277 абшчын ЕХБ, якія дзейнічалі ў БССР, з колькасцю веруючых у іх – 17035, з іх 204 зарэгістраваны (13450 веруючых) [6, арк. 283; спр. 5, арк. 67].

В. Чэчнеў інфармаваў аб адсутнасці адкрытых выступленняў супраць зліцця ў адзіны саюз, сцвярджаў, што амаль усе прэсвітэры ахвотна прынялі зацверджанае на пашыранай нарадзе ў Маскве пагадненне і падпісалі устаноўленую для іх апытальную анкету [6, арк. 158]. І тым не менш, нягледзячы на значную колькасць далучаных абшчын пяцідзесятнікаў да Саюза, паведамленні кіраўнікоў Саюза пра адсутнасць адкрытых выступленняў, з упэўненасцю можна сказаць, што працэс аб'яднання не задаволіў ні адзін, ні другі бок. Вельмі часта сустракаліся выказванні, што далучэнне пяцідзесятнікаў да Саюза УСЕХБ з'яўлялася фармальным з мэтай арганізаваць, аформіць дакументы і пасля патрабаваць стварэння арганізацыі Саюза пяцідзесятнікаў [6, спр. 5, арк. 59]. Галоўным клопатам кіраўнікоў УСЕХБ і ўлад заставалася ў наступныя гады праблема пастаяннага парушэння Жнівеньскага пагаднення ў абшчынах. Менавіта з першых дзён аб'яднання, як гэта ні парадаксальна, пачалі фарміравацца перадумовы да рознагалосся паміж Саюзам ЕХБ і пяцідзесятнікамі і, як вынік, – крызіс і раскол у 1960-я гг.

Такім чынам, у пасляваенныя гады адбылося арганізацыйнае афармленне дзейнасці евангельскіх хрысціян, баптыстаў і пяцідзесятнікаў на тэрыторыі СССР, што садзейнічала легалізацыі і ўнармаванню іх дзейнасці. Пры гэтым веруючыя, прыстасоўваючыся да савецкага заканадаўства, страчвалі пэўныя свабоды ў рэлігійным жыцці. Да УСЕХБ былі далучаны пяцідзесятнікі, што выклікала рознагалоссе: з аднаго боку, імкненне дзяржавы кантраляваць

пяцідзесятнікаў у Саюзе ЕХБ без уліку рэлігійных асаблівасцей баптыстаў і пяцідзесятнікаў, а з другога – злоўжыванні кіраўнікоў ЕХБ у дачыненні да пяцідзесятнікаў, якія не згаджаліся мяняць свае рэлігійныя традыцыі, прывялі да выхаду часткі незадаволеных пяцідзесятнікаў і пераходу да нелегальнай дзейнасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Митрохин Л.Н.*** Баптизм: история и современность (философско-социологический очерк). – СПб., 1997. – С. 399.
2. ***История евангельских христиан-баптистов в СССР.*** – М., 1989. – С. 11.
3. ***О религии и церкви:*** Сб. высказываний классиков марксизма-ленинизма, документов КПСС и Советского государства / Сост. ***А.М. Залесский, Т.Г. Купченя.*** – Мн., 1993. – С. 81.
4. ***Баптизм и баптисты*** (социологический очерк). – Мн., 1969. – С. 35.
5. ***Лившиц Г.М.*** Религия и церковь в истории общества. – Мн., 1980. – С. 304.
6. ***Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь***, фонд 952, воп. 2, спр. 2, арк. 29.



## S U M M A R Y

*The article deals with the issue of creation of the All-Union Association of Evangelical Christian-Baptist Churches (AUAECBC), which is considered as a midpoint of the Protestant Church history in the post-war period. The main causes and consequences that called forth the unification of various directions of Protestantism are determined and formulated.*



*Поступила в редакцию 11.10.2004*